ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 12 (499) | Субота, 10 красавіка 1982 года | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## ВАХТА МІРУ ПРАЦЯГВАЕЦЦА

У падраздзяленнях універсітэта, на яго кафедрах, у студэнцкіх групах у рамках дзён вахты міру праводзіцца збор сродкаў у Фонд міру. Калектыў эканамічнага факультэта — выкладчыкі, супрацоўнікі, студэнты — ужо завяршылі збор сродкаў у Фонд міру. Арганізатарам гэтай справы на факультэце была выкладчыца Г. М. Коўзік, дзякуючы якой кампанія прайшла хутка і дакладна. Сабрана больш тысячы рублёў.

Заканчваецца збор сродкаў на гісторыка-філалагічным факультэце. Многа ўвагі ўдзяляе гэтаму асістэнт кафедры гісторыі СССР і ўсеагульнай гісторыі У. У. Багамольнікаў. Тут сабрана ўжо 770 рублёў.

Актыўна адгукнуліся на ўдзел у чарговым мерапрыемстве вахты міру супрацоўнікі кафедры палітэканоміі, навуковага камунізму, гісторыі КПСС, педагогікі і псіхалогіі, оптыкі, факультэта фізічнага выхавання, навукова-даследчага і вучэбнага аддзелаў, канцылярыі, бухгалтэрыі, аддзела кадраў універсітэта.

**Ю. ЛІХУТА,**
**старшыня універсітэцкай камісіі садзейнічання Фонду міру.**

## ПАЭМА ПРА КАМУНІСТА

Кніга Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева «Успаміны» адразу пасля свайго выхаду ў свет стала настольнай для самага шырокага кола чытачоў. Людзі старэйшага пакалення ўбачылі ў ёй і ацанілі дакументальную дакладнасць адлюстравання часоў сваёй маладосці, часоў пабудовы сацыялістычнага грамадства ў нашай краіне. Прычым, пачынаць усякую справу вельмі цяжка. Тут для поспеху патрэбна не проста жаданне, патрэбен энтузіязм, нават самаахвяраванне. Моладзь у гэтай кнізе вабяць прыклады гераічнага ў будзённым. Вось і ў нашым універсітэце «Успаміны» не проста прачыталі. іх рашылі абмеркаваць, пагаварыць аб усім, што кранула.

Нядаўна такое абмеркаванне прайшло на біялагічным факультэце. Яно было арганізавана сумесна выкладчыкамі факультэта, супрацоўнікамі універсітэцкай бібліятэкі і кнігарні № 19. Агульныя намаганні далі свой плён, таму што кожны ўнёс сваю працу: выкладчыкі і студэнты падрыхтавалі грунтоўныя даклады па асноўных тэмах, узнятых у кнізе таварыша Л. І. Брэжнева «Успаміны»; супрацоўніца бібліятэкі Н. П. Кашпай выступіла з інфармацыяй аб укладзе бібліятэкараў у прапаганду кнігі; прадаўцы кнігарні № 19 Н. А. Бетанава і Е. І. Грабцэвіч падрыхтавалі бібліяграфічны агляд кніг таварыша Л. І. Брэжнева і кніг, якія прысвячаюцца яго асабістаму жыццёваму шляху.





Дзякуючы гэтаму абмеркаванне стала не проста поўным і цікавым, а абдымным і бачным.

Адкрыла канферэнцыю выкладчыца кафедры філасофіі Тамара Трафімаўна Галеева. Яна прадаставіла слова дацэнту кафедры гісторыі КПСС І. А. Ільіных. Іван Апанасавіч узнагароджаны ганаровым знакам «50 год знаходжання ў КПСС». У той час, аб якім піша ў сваёй кнізе Л. І. Брэжнеў, І. А. Ільіных быў на важных участках будаўніцтва новага грамадства. Як ён падкрэслівае, у кнізе дакладна і любоўна перададзены парыў, які ахапіў у той час усю краіну ад вялікіх індустрыяльных цэнтраў да ўскраін. Гэта гісторыя рабочага класа. Неадрыўна ад яе, у злітнасці з ёю можна прасачыць фарміраванне і станаўленне самога Леаніда Ільіча Брэжнева. Адна з галоўных думак кнігі — спадчыннасць, пераемнасць пакаленняў.

Студэнтка Т. Дзянісава тэмай свайго выступлення выбрала біяграфію таварыша Л. І. Брэжнева. Па кнізе «Успаміны» можна прасачыць адзін з галоўных яе этапаў: выхаванне ў рабочай сям'і, у рабочым калектыве, якія далі загартоўку на многія гады, сталі практычна пачаткам фарміравання таварыша Л. І. Брэжнева як паслядоўнага і непахіснага прадаўжальніка справы вялікага Леніна.

Студэнты С. Гронская, В. Данькіна, А. Кусянкоў у сваіх выступленнях гаварылі аб шматпланавасці і ўсеабдымнасці паказу жыцця ў кнізе «Успаміны»: аб значнасці народа ў сацыялістычным будаўніцтве, аб пераемнасці пакаленняў, аб ідэалагічнай барацьбе.

Кандыдат эканамічных навук Н. П. Пухава, падводзячы вынік сказанага, падкрэсліла, што кніга «Успаміны» выклікае жаданне зверыць свае справы і ўчынкі з тым жыццём, якое прайшоў Л. І. Брэжнеў.

Ёмiста і бачна паўстае перад намі вобраз аўтара кнігі, вобраз камуніста ленінскай школы, які прайшоў шлях ад простага рабочага да выдатнага палітычнага і дзяржаўнага дзеяча сучаснасці. Вобраз велізарнай чалавечай душэўнасці.

Так заканамерна змыкаюцца ў нашым жыцці часы — гераічныя часы, калі закладваліся асновы нашай дзяржавы, і гераічнае цяпер. Быццам бы з рук у рукі, пакаленні савецкіх людзей перадаюць эстафету гераічных спраў нашай Радзімы. І раскрываецца перад намі: за ўзятай вышынёй — новая вышыня нашага жыцця...

**М. ШЫМАНОЎСКАЯ.**

**На здымках: ля выстаўкі твораў Генеральнага сакратара ЦК КПСС таварыша Л. І. Брэжнева; у зале ў час канферэнцыі.**

**Фота У. Чысціка.**

З АГУЛЬНАУНІВЕРСІТЭЦКАГА ПАРТЫЙНАГА СХОДУ

## ВЫРАШАЦЬ ПАСТАЎЛЕНЫЯ ЗАДАЧЫ

У нашай газеце паведамлялася ўжо аб праведзеным агульнауніверсітэцкім партыйным сходзе, на якім абмеркавана пытанне «Аб рабоце дэканата і партыйнага бюро эканамічнага факультэта па выкананню дырэктыў партыі і ўрада, рашэнняў калегій Мінвуза СССР і БССР, указанняў мясцовых партыйных і савецкіх органаў». Са змястоўным дакладам выступіў дэкан эканомфака **І. П. Трацэўскі.** Спачатку ён гаварыў аб тых задачах, якія неабходна вырашаць вышэйшай школе ў святле рашэнняў XXVI з'езда КПСС. Іх паспяховаму ажыццяўленню ў цяперашні час павінна садзейнічаць актыўная падрыхтоўка да 60-годдзя ўтварэння СССР.

За гады існавання эканамічнага факультэта, падкрэсліў дакладчык, на стацыянары падрыхтавана 1246 спецыялістаў з вышэйшай эканамічнай адукацыяй. Акрамя таго, 817 чалавек набылі яе па завочнай і 56 — па вячэрняй форме навучання. За гады бягучай пяцігодкі толькі на дзённым аддзяленні факультэта будзе падрыхтавана звыш 900 маладых спецыялістаў.

Далей дакладчык адзначыў, што на факультэце ідзе працэс не толькі колькаснага росту, але і якаснага ўдасканальвання падрыхтоўкі спецыялістаў. Партыйная і грамадскія арганізацыі, дэканат і кафедры эканомфака праводзяць вялікую работу па выкананню пастаноў партыі і ўрада «Аб далейшым развіцці вышэйшай школы і павышэнні якасці падрыхтоўкі спецыялістаў», «Аб паляпшэнні эканамічнай адукацыі працоўных», «Аб мерах па далейшаму ўдасканальванню вышэйшай адукацыі ў краіне», «Аб павышэнні эфектыўнасці навукова-даследчых работ у ВНУ», «Аб паляпшэнні планавання і ўзмацненні ўздзеяння гаспадарчага механізма на эфектыўнасць вытворчасці і якасці работы» і інш.

За апошні гады, гаварыў І. П. Трацэўскі, работа калектыву факультэта неаднаразова заслухоўвалася на Савеце універсітэта, пасяджэннях парткома, яго камісіі па кантралю вучэбна-выхаваўчага працэсу, на калегіі Мінвуза БССР. Такая ўвага да факультэта дазволіла ухіліць шэраг недахопаў, выйсці на новыя рубяжы ў розных напрамках шматграннага вузаўскага жыцця.

Эфектыўнасць і канчатковыя вынікі дзейнасці вузаўскіх калектываў вымяраюцца перш за ўсё працоўнымі дасягненнямі іх выпускнікоў. І дакладчык зазначыў, што на факультэт сістэматычна прыходзяць добрыя водгукі аб узроўні прафесійнай падрыхтоўкі выпушчаных эканамістаў. Многія з іх сталі кіраўнікамі эканамічных служб прадпрыемстваў і арганізацый, вылучаны на партыйную, камсамольскую і прафсаюзную работу. Трое выпускнікоў факультэта — **Л. Е. Аксёнава, В. А. Трухаў**, А. В. Сасноў — паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Многія з выпускнікоў цяпер займаюцца ў аспірантуры.

Заўсёды ў цэнтры ўвагі дэканата, партбюро, грамадскіх арганізацый факультэта, падкрэслівае І. П. Трацэўскі, знаходзіцца студэнт. Яго прафесіянальны рост, выхаванне, патрэбы і клопаты неаднаразова станавіліся прадметам дзелавой размовы на пасяджэннях дэканата і Савета факультэта, партбюро, прафбюро і камітэта ЛКСМБ, на групавых, курсавых і факультэцкіх сходах. нарадах куратараў і студэнцкага актыву.

У сваім дакладзе І. П. Трацэўскі значную ўвагу ўдзяліў падбору кадраў і ўмацаванню навуковага патэнцыялу факультэта, стварэнню ў калектыве здаровага творчага мікраклімату.

Для актывізацыі логіка-мысліцельскай дзейнасці студэнтаў на факультэце практыкуецца правядзенне лекцыйных заняткаў на аснове праблемнага навучання. У практыку вучэбнага працэсу ўкаранёна вырашэнне вытворчых сітуацый. Па курсах «Фінансы прамысловасці» і «Агульная тэорыя статыстыкі» распрацаваны, распаўсюджаны і выкарыстоўваюцца альбомы наглядных дапаможнікаў. Па курсу «Тэхнічнае нарміраванне працы» лабараторныя заняткі праводзяцца непасрэдна на рабочых месцах прамысловых прадпрыемстваў г. Гомеля. У практыку ўводзяцца элементы непарыўнай эканамічнай падрыхтоўкі студэнтаў, г. зн. працэс падрыхтоўкі будучага спецыяліста разглядаецца адначасова як вучэбны і навуковы. За кожным выкладчыкам, пачынаючы з першага курса, замацоўваецца 4—5 студэнтаў. Ён займаецца з імі навукова-даследчай і выхаваўчай работай на працягу ўсіх пяці гадоў вучобы.

Расказаўшы аб усіх апраўдаўшых сябе формах і метадах падрыхтоўкі і выхавання маладых спецыялістаў, І. П. Трацэўскі спыніўся і на маючых месца недахопах. На сённяшні дзень яшчэ не задавальняе ўзровень паспяховасці студэнтаў. Паступаючыя на факультэт абітурыенты маюць сярэдні бал атэстата не ніжэй 4,5. Даволі значная ўдзельная вага медалістаў і выдатнікаў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. Аднак па паспяховасці эканомфак на працягу многіх гадоў займае толькі 3—4 месцы.

Дакладчык справядліва крытыкаваў камуністаў **А. Ермакова, Е. Андрэеву, Л. Тубол**, якія не паказваюць прыклад у вучобе, у мінулай сесіі мелі нездавальняючыя адзнакі.

У дакладзе знайшлі шырокае асвятленне пытанні па ліквідацыі прабелаў, якія былі выяўлены на факультэце камісіямі Мінвуза БССР, па павышэнню ролі куратараў умацаванню матэрыяльна-тэхнічнай базы, пашырэнню і паглыбленню навуковых даследаванняў і інш.

Гаворачы аб арганізацыі ва універсітэце сацыялістычнага спаборніцтва, І. П. Трацэўскі зазначыў, што яно з'яўляецца магутным рычагом для паспяховага вырашэння ўсіх пастаўленых задач, дасягнення ўсё больш высокіх паказчыкаў па ўсіх напрамках вузаўскай дзейнасці. Разам з тым ён звярнуў увагу на неабходасць удасканальвання арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва ў ГДУ, большай яго галоснасці і аб'ектыўнасці пры падвядзенні вынікаў.

Дакладчык запэўніў камуністаў універсітэта, што партыйная арганізацыя эканамічнага факультэта, увесь калектыў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў прыкладуць максімум намаганняў для паспяховага выканання рашэнняў XXVI з'езда КПСС, XXIX з'езда КПБ, іншых рашэнняў партыі і ўрада, мясцовых партыйных і савецкіх органаў, загадаў і пастаноў Мінвуза СССР і БССР.

Па абмяркоўваемаму на партыйным сходзе пытанню выступілі прарэктары: па навуковай рабоце — **М. В. Навучыцель**, па вучэбнай — **Л. А. Шамяткоў**, дэкан гісторыка-філалагічнага факультэта **Т. І. Язэпава**, намеснік старшыні мясцкома **Ю. А. Кашын**, сакратары партбюро матэматычнага факультэта — **Л. Я. Палякоў**, геалагічнага — **Ж. А. Герасімава**, сакратар камітэта камсамола **С. У. Аўсеенка**, загадчык кафедры тэарэтычных асноў фізічнага выхавання **А. Ф. Семікоп**, студэнтка эканамічнага факультэта **Зінаіда Дзенісенка**. Была прынята адпаведная пастанова.

У рабоце агульнауніверсітэцкага партыйнага сходу прыняў удзел загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Цэнтральнага райкома КПБ **А. Д. Курачэнка.**

*Аб лаўрэатах штогадовых навуковых чытанняў*

# ЗАЎСЁДЫ Ў ПОШУКУ



М. І. РУБЦОЎ



У. І. МІРОНЕНКА



І. В. МАКСІМЕЙ



А. П. ПІНЧУК



С. С. ГІРГЕЛЬ

Дасягненні навукі і тэхнікі адыгрываюць рашаючую ролю ў павышэнні эфектыўнасці сацыялістычнай вытворчасці, пераводзе яе на шлях інтэнсіўнага развіцця. У адзінаццатай пяцігодцы развіццё навукі і тэхнікі павінна быць, як прадугледжана XXVI з'ездам партыі, у яшчэ большай ступені падпарадкавана вырашэнню эканамічных і сацыяльных задач. Гэта асноўнае патрабаванне знайшло адлюстраванне ў рашэннях лістападаўскага (1981 года) Пленума ЦК КПСС і ў зацверджаным Вярхоўным Саветам СССР Дзяржаўным плане эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады. Усё гэта накладвае вялікую адказнасць на навуковыя ўстановы. На лістападаўскім (1981 года) Пленуме ЦК КПСС прама гаварылася аб неабходнасці ўзняць ролю навукі, дабіцца больш эфектыўных вынікаў. «У навуцы, натуральна, павінен дзейнічаць прынцып спаборніцтва», — сказаў у сваёй прамове на Пленуме ЦК КПСС таварыш Л. І. Брэжнеў.

Менавіта ў адпаведнасці з гэтымі палажэннямі і патрабаваннямі ў нашым універсітэце стала добрай традыцыяй праводзіць у рамках Дня савецкай навукі навуковыя чытанні. Іх мэта — актывізаваць творчую дзейнасць прафесарска-выкладчыцкага саставу і іншых навуковых работнікаў.

На гадавыя навуковыя чытанні прадстаўляюцца, як правіла, работы, выкананыя ў апошнія пяць гадоў па важнейшай тэматыцы плана НДР універсітэта, апублікаваныя ў выглядзе кніг або артыкулаў у цэнтральных або рэспубліканскіх выданнях, атрымаўшыя прызнанне навуковай грамадскасці. Важнейшай умовай лічыцца вырашэнне актуальных для навукі і народнай гаспадаркі задач.

Аўтарам прысвойваецца ганаровае званне «Лаўрэата гадавых навуковых чытанняў». Лаўрэатамі гадавых навуковых чытанняў у свой час былі многія вядучыя выкладчыкі і навуковыя супрацоўнікі нашага універсітэта.

У гэтым годзе на чытанні прадстаўлена пяць работ.

Работа доктара філасофскіх навук, прафесара М. І. Рубцова «Суадносіны пераканання і прымушэння ў працэсе выхавання працоўнай дысцыпліны» мае значэнне для навукі і практыкі. Аўтар асноўную ўвагу звярнуў на аналіз суадносін і адрознення паміж насіллем і прымушэннем, якія ў нашай філасофскай літаратуры часта атоесамліваюцца. Гэта атоесамліванне, як паказвае М. І. Рубцоў, звязана з забыццём таго факта, што прымушэнне звязана з адказнасцю і маецца на ўвазе як свабода выбару, так і свабода ў дыялектыка-матэрыялістычным разуменні. У рабоце паказана, што прымушэнне з'яўляецца, з аднаго боку, пэўнымі грамадскімі адносінамі, а з другога — неад'емным элементам кіравання; акрамя таго, яно знаходзіцца ў дыялектычнай сувязі з перакананнем. Раскрываючы паняцце «перакананне», аўтар прыводзіць аналіз, які, на яго думку, не знайшоў належнага асвятлення ў нашай грамадазнаўчай навуцы.

Практычнае значэнне работы даследуецца на аснове вытворчай дзейнасці працоўных калектываў, аналіза метадаў і сродкаў умацавання працоўнай, вытворчай дысцыпліны. Дысцыпліна, як гаворыцца ў рабоце, уяўляе сабой форму грамадскай сувязі паміж людзьмі, якая аб'ектыўна ўзнікае з матэрыяльных умоў вытворчасці і характара вытворчых адносін. І, нарэшце, у рабоце звязваецца прабляма дыялектыкі пераканання і прымушэння з фарміраваннем сацыялістычнага ладу жыцця, што недастаткова аналізавалася ў вядомай аўтару філасофскай і сацыялагічнай літаратуры.

Дэкан геалагічнага факультэта, дацэнт А. П. Пінчук на працягу 1976—1981 гадоў апублікаваў у цэнтральным і рэспубліканскім друку серыю артыкулаў. Работы змешчаны ў асноўным у дакладах АН СССР і АН БССР, што пацвярджае сур'ёзную навуковую прапрацоўку тэмы і яе актуальнасць. На аснове гэтых артыкулаў і ўзнікла работа «Геаэлектрычныя і геатэрмічныя палі тэрыторыі БССР». Па выніках работы пабудаваны карты сумарнай падоўжнай праводнасці асадачнага чахла тэрыторыі БССР і геатэрмічныя карты асадачнага басейна Прыпяцкага прагібу. Даследаванні маюць важнае практычнае і тэарэтычнае значэнне. Даказана істотная роля канвектыўнага цеплапераносу ў асадачнай тоўшчы Прыпяцкага прагібу. Гэта дае магчымасць удакладніць гідрагеалагічную абстаноўку артэзіянскага басейна і ацаніць перспектывы нафтаноснасці адкладанняў. Высвятленне структуры геатэрмічных палёў дазволіла выкарыстаць гэтыя даныя ў тэхналогіі бурэння. Пракладзены шляхі да вывучэння структуры крышталёвага асновання Беларускага масіву з мэтай пошуку рудных целаў.

Для загадчыка кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў У. І. Міроненкі шлях да працы «Адлюстроўваючая функцыя і перыядычныя рашэнні дыферэнцыяльных ураўненняў» пачаўся са знаёмства з працамі вядомага рускага матэматыка А. М. Ляпунова. Спачатку гэта была вучоба для маладога вучонага, а потым ужо многія думкі нараджаліся ў час падрыхтоўкі да лекцый. Як падкрэслівае сам У. І. Міроненка, для яго гэта працэс творчы. У 1981 годзе ў выдавецтве БДУ імя У. І. Леніна выйшла манаграфія вучонага «Лінейная залежнасць функцый уздоўж рашэнняў дыферэнцыяльных ураўненняў». Такім чынам, завершана сур'ёзная і складаная работа, распрацаваны метад, які дазваляе ў некаторых выпадках яўна знаходзіць адлюстраванне за перыяд (адлюстраванне Пуанкарэ) для перыядычных дыферэнцыяльных сістэм, рашэнні якіх не могуць, наогул гаворачы, быць знойдзены ў яўным выглядзе. У работах У. І. Міроненкі выдзелены і вывучаны новы клас нелінейных дыферэнцыяльных сістэм з элементарнымі рашэннямі (клас укладальных сістэм) і распрацаваны метад рашэння задачы Кашы для такіх сістэм.

У рабоце дацэнта кафедры матэматычных праблем кіравання І. В. Максімея «Распрацоўка сродкаў даследавання і арганізацыі вылічальнага працэсу ў ВК калектыўнага карыстання» разгледжаны метады і сродкі мадэлявання працэсаў у вылічальных комплексах калектыўнага карыстання і метады іх рэалізацыі на ЭВМ. Праца гэтая мае вялікае народнагаспадарчае значэнне для распрацоўкі аўтаматызаваных сістэм кіравання і праектавання. Калегі І. В. Максімея прафесар В. П. Рубанік і кандыдат фізіка-матэматычных навук В. Л. Мярэжа адзначаюць навукова-тэарэтычнае і прыкладное значэнне работы, значны ўклад у распрацоўку матэматычнага забеспячэння вылічальных сістэм.

Цыкл работ «Распаўсюджанне электрамагнітных хваляў у магнітаўпарадкаваных крышталях» выкананы ў апошнія пяць гадоў у Інстытуце фізікі АН БССР і Гомельскім дзяржаўным універсітэце на кафедры оптыкі С. С. Гіргелем у сааўтарстве з акадэмікам АН БССР Б. В. Бокуцем. Работы прысвечаны тэарэтычнаму вывучэнню аптычных уласцівасцей магнітаўпарадкаваных крышталяў. Вынікі і вывады работы маюць навуковае і практычнае значэнне. Да таго ж яна вельмі актуальная: магнітааптычныя метады даследавання змогуць служыць надзейным інструментам вывучэння розных уласцівасцей цвёрдых цел. Напрыклад, ёсць думка, што наступнае пакаленне вылічальных машын будзе мець магнітааптычныя сістэмы аператыўнай памяці замест магнітных, як цяпер. Таму вывучэнне заканамернасцей распаўсюджання святла ў асяроддзі, якое валодае магнітнай структурай, з'яўляецца адной з актуальных задач сучаснай оптыкі.

**М. ТВАРДОЎСКІ,**
**загадчык НДС ГДУ.**

Фота У. Чысціка.

*У дазоры—народныя кантралёры*

# ТЭХНІЦЫ—НАГРУЗКУ

Члены галаўной групы народнага кантролю праверылі стан уліку і выкарыстання вылічальнай тэхнікі на матэматычным і эканамічным факультэтах. На сённяшні дзень тут налічваецца 166 адзінак розных вылічальных машын. Як жа яны выкарыстоўваюцца на практыцы?

На кафедры вылічальных машын і праграмавання з 62 правераных машын у спраўным стане было толькі 16, на кафедры дыферэнцыяльных ураўненняў — з трох машын працуе толькі адна. У цэлым па матэматычнаму факультэту прастойвае больш 70 працэнтаў вылічальнай тэхнікі. Ужо некалькі гадоў запар з-за неспраўнасці не выкарыстоўваецца ў вучэбным працэсе вялікая колькасць машын розных марак. Многія з іх не спісваюцца, не наладжаны іх своечасовы рамонт.

На эканамічным факультэце вылічальная тэхніка захоўваецца ў непрыстасаваных месцах, як, напрыклад, у адной з лабараторый, якой загадвае М. В. Бібікава.

Узнікае неабходнасць заключэння дагавору паміж універсітэтам і Гомельскім вытворчым участкам па рамонту вылічальнай тэхнікі. Каб адрамантаваць тэхніку, неабходны запчасткі. Для гэтага трэба звярнуцца ў аб'яднанне «Белліктэхніка».

Вучэбнаму аддзелу універсітэта неабходна ўзмацніць кантроль за выкарыстаннем тэхнічных сродкаў у вучэбным працэсе.

СССР 60

# ВЫДАДЗЕНА ДА ЮБІЛЕЮ КРАІНЫ

**У. І. Ленін, КПСС аб Савецкай шматнацыянальнай дзяржаве. 1981 г.**

У гэты тэматычны зборнік уключаны артыкулы, прамовы, пісьмы і асобныя выказванні У. І. Леніна, дакументы КПСС, даклады і выступленні таварыша Л. І. Брэжнева, у якіх адлюстраваны гісторыя, тэорыя, ленінскія прынцыпы і практыка будаўніцтва Савецкай шматнацыянальнай дзяржавы, інтэрнацыянальная сутнасць нацыянальнай палітыкі КПСС.

**Клопат партыі і ўрада аб дабрабыце народа. Зборнік дакументаў (1974 г. — люты 1980 г.). Кніга другая. 1980.**

У кнігу ўключаны рашэнні XXV з'езда КПСС, пленумаў ЦК, пастаноў ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, законы, указы Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, якія былі прыняты ў 1974 г. — лютым 1980 г. па пытаннях, звязаных з далейшым павышэннем дабрабыту савецкіх людзей.

**Лук'янава А. І., Кузьмін Э. Л. і інш. Савецкая Канстытуцыя і міфы саветолагаў. 1981.**

У кнізе ў публіцыстычнай, палемічнай форме выкрываюцца фальсіфікатарскія выдумкі заходніх каментатараў новай Канстытуцыі СССР. Асвятляючы асноўныя рысы Канстытуцыі развітога сацыялізму, аўтары паказваюць гістарычныя перавагі гэтага дакумента перад буржуазнымі канстытуцыямі.

**Партыя і Саветы. (Б. М. Марозаў і інш.). 1982.**

У кнізе абагулены гістарычны вопыт КПСС па ўмацаванню і ўдасканаленню Саветаў — галоўнай формы народаўладдзя ў нашай краіне.

**Лебедзеў Н. І., Лазарэнка Т. М. Перамога ленінскай нацыянальнай палітыкі. 1981.**

На шляху, які ўказаў У. І. Ленін, савецкі народ пад кіраўніцтвам КПСС даў усяму свету ўзор справядлівага вырашэння нацыянальнага пытання — аднаго з самых вострых і драматычных пытанняў у гісторыі чалавецтва.

**Сікорскі В. М. Партыя класа, партыя народа. 1980.**

У кнізе разглядаюцца заканамернасці жыцця і дзейнасці КПСС на сучасным этапе развіцця сацыялізму. Асаблівая ўвага ўдзяляецца дыялектыцы класавага і агульнанароднага ў прыродзе, характары і дзейнасці партыі.

**Н. ШАТОН,**
**прадавец кнігарні № 19.**

